■ Ёсць пытанне

# ЦІ БРАЦЬ МУЖА Ў РАДЗІЛЬНЮ?



**Калі я абмовілася пра тэму, на якую збіраюся пісаць, муж паморшчыўся: «Узялі моду мужыкоў на роды цягаць. Не наша гэта справа». Я паспрабавала была прывесці довады «за», але ён толькі адмахнуўся. І сапраўды, роды заўсёды лічыліся чыста жаночай справай, і мужчыны мала праяўлялі да гэтага цікавасці. Яшчэ гадоў дзесяць таму нават выраз «партнёрскія роды» гучаў чужародна, а з'ява была даволі рэдкая. Сёння прысутнасць мужчыны ў радзільнай зале не выклікае здзіўлення, хоць пытанне наконт гэтай неабходнасці застаецца адкрытым. Адны жанчыны лічаць, што нельга траўмаваць мужчыну, другія настойваюць, што муж павінен на свае вочы ўбачыць, як нялёгка даюцца дзеці. Вопытам сумесных родаў падзяліліся маладыя бацькі Тацяна і Уладзімір РОЛЕВЫ.**

Паўгода таму ў сям'і Уладзіміра і Тацяны з'явіўся доўгачаканы сыночак. Даведаўшыся пра цяжарнасць, яны адразу вырашылі, што будуць «нараджаць разам». «Я не хадзіла вакол мужа з угаворамі, — успамінае Тацяна. — На сваю прапанову пачула адразу: «Добра, я пайду з табой!» Але мы ўсё ж дамовіліся, што калі Валодзя падчас родаў раптам захоча выйсці, то ён можа гэта зрабіць. Але ў яго такога жадання не ўзнікла».

Сёння Тані здаецца, што яна не справілася б без падтрымкі мужа. Яна нават не магла ўявіць, што будзе так балюча... «Абязбольвальныя прэпараты на мой арганізм не падзейнічалі. І страшна ўявіць, што я магла на 5 гадзін застацца сам-насам з гэтымі пакутамі. Муж вельмі падтрымліваў, дапамагаў. Мяне ўвесь час мучыла смага, і ён мачыў мне вусны сурвэткай. Я сціскала яму рукі ад болю, а ён усё спакойна трываў, падбадзёрваў. Трэба валодаць неверагодна моцнымі нервамі, каб назіраць боль дарагога чалавека. Не кожны зможа гэта вытрываць. Я крыху разгубілася, усё, чаму вучылася на курсах, на імгненне вылецела з галавы. Муж нагадваў, як трэба правільна дыхаць. Гэта такое шчасце, што ён быў са мной побач!»

Уладзімір застаўся з Таняй і калі пачаліся роды. А ўзяўшы на рукі свайго нованароджанага сыночка, зразумеў, што ўсе выпрабаванні вартыя гэтага шчаслівага моманту. «Я адчуваю да мужа неверагоднае пачуццё падзякі, — дзеліцца Тацяна. — Ён мне таксама дзякаваў пасля родаў за магчымасць убачыць, як з'явілася на свет наша дзіця. Пасля таго дня мы яшчэ больш з'ядналіся, сталі раднейшымі адно аднаму.Упэўнена, што і на другія роды мы абавязкова пайшлі б разам».

* * *

**Ці бяспечныя партнёрскія роды для сямейных адносін? Пра гэта і іншае мы пагутарылі з акушэрам-гінеколагам 5-й мінскай клінічнай бальніцы, кіраўніком «Сямейнай акадэміі здароўя» Дзіянай МАРДАС.**

— Курсы па падрыхтоўцы да нараджэння малога карыстаюцца вялікім попытам, і будучыя таты на іх зусім не рэдкія госці. На занятках паводзяць сябе нават больш актыўна, чым мамы: задаюць пытанні, удакладняюць, канспектуюць. У «Сямейнай акадэміі здароўя» мы праводзім фотасесіі на занятках. Вельмі кранальна, калі тата раздрукоўвае здымкі, каб захаваць у альбоме ўспаміны пра тое, як ён рыхтаваўся да гэтай доўгачаканай падзеі. Пасля сумеснага навучання ў будучых бацькоў з'яўляецца ўпэўненасць, што яны з усім справяцца. Жанчына пазірае на мужа з павагай і гонарам.

Што тычыцца курса «Партнёрскія роды», то ён праводзіцца ў многіх радзільнях. Для тых, хто плануе нараджаць з партнёрам, гэтая падрыхтоўка абавязковая. У дзень «ікс» пары прыязджаюць разам. Дарэчы, кожны тыдзень у нашым раддоме адбываюцца мінімум адны партнёрскія роды, бывае і 2—3.

**Курсы па падрыхтоўцы да нараджэння малога карыстаюцца вялікім попытам, і будучыя таты на іх зусім не рэдкія госці. На занятках паводзяць сябе нават больш актыўна, чым мамы: задаюць пытанні, удакладняюць, канспектуюць.**

**— Ці варта ўгаворваць мужа, калі ён не згаджаецца ісці разам?**

— Ні ў якім разе. Гэтае рашэнне трэба прымаць удваіх. Растлумачце мужу, чаму вы хочаце, каб ён прысутнічаў. Калі ён згодны — выдатна, калі не, лепш пакіньце гэтую ідэю. Зусім нармальна не жадаць парных родаў. Бывае так, што мужчына настойвае, а жанчына супраць. Паўтараю, павінна быць толькі агульнае жаданне.

**— Чым рэальна можа дапамагчы мужчына ў родах?**

— Перш за ўсё ён кантралюе сітуацыю, падлічвае схваткі. Сочыць, каб жанчына правільна дыхала, робіць ёй расслабляльны масаж, аблягчае болевыя адчуванні з дапамогай спецыяльных рэлаксуючых тэхнік. Усяму гэтаму пары навучаюцца на курсах. І, натуральна, маральная падтрымка ад роднага чалавека для жанчыны ў родах асабліва важная.

**— Ці заўсёды мужчына прысутнічае ў радзільнай зале?**

— Партнёрскія роды могуць праходзіць па двух сцэнарыях. Першы — калі муж знаходзіцца толькі ў перадродавай. Першага крыку немаўляці ён чакае пад дзвярыма. Неўзабаве тату дазваляюць зайсці і ўзяць малога на рукі. Гэты варыянт найбольш распаўсюджаны.

Другі варыянт — гэта прысутнасць і ў радзільнай зале ў тым ліку. Але мужчына падчас родаў знаходзіцца за галавой жанчыны. Бывае, што татам у гэтым выпадку нават даваяраюць перарэзаць пупавіну.



**— Ці могуць партнёрскія роды адбіцца негатыўна на сямейных адносінах?**

— Гэта можа здарыцца толькі ў тым выпадку, калі хто-небудзь з партнёраў першапачаткова быў не гатовы. Так, напрыклад, жанчына спадзявалася на падтрымку мужа, а ён ад убачанага разгубіўся, нават прытомнасць страціў. Яна пачынае за яго хвалявацца, што ў такой сітуацыі ён на шкоду. Праз гэта жанчына можа расчаравацца ў партнёры, маўляў, не апраўдаў надзеі. Плюс сам працэс родаў можа выклікаць у маральна непадрыхтаванага мужчыны непрыемныя адчуванні, надоўга запомніцца і выклікаць дрэнныя ўспаміны ў далейшым. Таму, калі жанчына ведае аб моцнай уражлівасці свайго мужа або яна не ўпэўнена ў яго вытрымцы, лепш не рызыкаваць. Не той выпадак, калі можна праводзіць эксперыменты.

**Яна ЛЫЧКОЎСКАЯ**

■ Паміж намі, мамачкамі

# ЗАСТРАХАВАЦЬ ЦЯЖАРНАСЦЬ

**Малому Тацяны Гірынай нядаўна споўнілася чатыры месяцы. Для 27-гадовай выкладчыцы па танцах і фітнесе гэта доўгачаканае дзіця, таму яна сур'ёзна паставілася да цяжарнасці і падрыхтавалася «на выдатна». Жанчына нават паспела зазірнуць у страхавую кампанію, каб на ўсялякі выпадак «перастрахавацца». Так, вам не падалося, сучасны спектр паслуг настолькі велізарны, што будучая маці мае магчымасць абараніць не толькі сябе, але і яшчэ не народжанае дзіця.**

«Пра паслугу «застрахаваць цяжарнасць» я даведалася выпадкова, — прызнаецца маладая маці. — Я бавіла час на розных форумах у пошуках належнай радзільні. Тады і натрапіла на цікавыя выпадкі, калі жанчыны шляхам страхавання вырашалі абараніць сваё здароўе і жыццё дзетак. Я застрахавала цяжарнасць і роды ў верасні мінулага года, калі была дзесяці на пятнаццатым тыдні. Кампанія прапаноўвала розныя па працягласці і кошце віды страхавання. Я вырашыла засцерагчы сябе і дзіця на год, аднак дамову пры неабходнасці можна працягваць. Такім чынам, калі з маім дзіцем здарыцца штонебудзь нядобрае да верасня, то яно атрымае матэрыяльную кампенсацыю».

Насамрэч, сёння ніхто не абаронены ад непрадказальных жыццёвых выпадкаў, тым больш будучыя матулі і іх дзеці. Як ні круці, грошы ў такіх выпадках не бываюць лішнімі. У Беларусі страхаваннем цяжарнасці і родаў займаецца адна з найбуйнейшых страхавых кампаній — Белдзяржстрах. «Паслуга «рэпрадуктыўнае страхаванне» размежавана не на шырокае кола карыстальніц, — падкрэслівае **Людміла КУЛАК, кіраўнік упраўлення медыцынскага страхавання прадпрыемства Белдзяржстрах.** — Аднак з кожным годам попыт на яе павялічваецца».

**У пакет паслуг уваходзілі такія выпадкі, як таксікозы на позніх тэрмінах, памылкі ўрачоў, разрывы пры родах — тое, з чым можа сутыкнуцца кожная жанчына.**

Паслугай «рэпрадуктыўнае страхаванне» можа скарыстацца кожная жанчына ва ўзросце да 50 гадоў, калі тэрмін цяжарнасці не перавышае 20 тыдняў. Таксама існуе варыянт страхавання «Гінекалогія», які гарантуе матэрыяльную падтрымку жанчыне (неабавязкова цяжарнай) ва ўзросце да 55 гадоў падчас выяўлення паталогіі, якая можа прывесці да негатыўных наступстваў: аперацый, інваліднасці або смерці.

«Па праўдзе кажучы, я ніколькі не пашкадавала, што застрахавала сябе і дзіця, — дзеліцца Тацяна. — Я заўважыла вельмі асцярожнае стаўленне медперсаналу да сябе. Акрамя гэтага, мне рабілі экстранная кесарава, нягледзячы на тое, што цяжарнасць працякала спакойна. У выніку я без праблем атрымала грошы па страхоўцы. Таксама ў пакет паслуг уваходзілі такія выпадкі, як таксікозы на позніх тэрмінах, памылкі ўрачоў, разрывы пры родах — тое, з чым можа сутыкнуцца кожная жанчына».

«Рэпрадуктыўнае страхаванне для жанчын — гэта даволі спецыфічная паслуга. Мы імкнёмся абараніць не толькі жанчыну, але і яшчэ не народжанае дзіця, — тлумачыць Людміла Кулак. — Страхавыя выпадкі бываюць зусім розныя. Дзеці нараджаюцца з родавымі траўмамі, інваліднасцямі, прыроджанымі парокамі. Ёсць варыянты страхавання толькі ў адносінах да жанчыны, у адносінах да жанчыны і дзіцяці і нават у адносінах да маці і некалькіх дзяцей, калі гэта шматплодная цяжарнасць».

**Крок за крокам: што патрэбна, каб застрахаваць сябе і сваё дзіця:**

1. Пракансультавацца ў спецыяліста страхавой кампаніі, каб даведацца пра магчымыя пакеты паслуг і выбраць найбольш прыдатны.
2. Узяць даведку з жаночай кансультацыі з указаннем тэрміну цяжарнасці і стану здароўя на момант страхавання.
3. Звярнуцца ў офіс страхавога прадпрыемства з пашпартам і даведкай для падпісання дамовы.
4. У страхавым выпадку неабходна прадставіць у страхавую кампанію абменную карту з раддома з адпаведным дыягназам, пашпарт і дамову.
5. Напісаць заяву ў офісе кампаніі.
6. Пачакаць 10 дзён, пакуль ідзе праверка, і атрымаць ліст ад кампаніі.
7. Атрымаць грошы па адрасе банка, азначаным у лісце.

***Пра што шэпчуцца будучыя мамы (вытрымкі з форумаў):***

**Leno4ka**

*«Дзяўчаты, існуе такое страхаванне, звязанае з цяжарнасцю і родамі. Хто страхаваўся, адгукніцеся. У мяне такой страхоўкі не было: даведалася пра яе, калі паклалі на захаванне. У нашай палаце дзяўчына ляжала са страхоўкай. Вось гэта абслугоўванне... На працягу дня медсёстры зазіралі з пытаннем «Як самаадчуванне?», усіх аглядалі з выкарыстаннем бальнічных прылад, у яе выпадку выкарыстоўвалі аднаразовыя, у чарзе па ўколы гэтая дзяўчына не стаяла, іх рабілі ёй у палаце... Гэта і сапраўды «захаванне», хоць бы ад стрэсу.»*

**олеч_ка**

*«Па праўдзе кажучы, я не разумею, як страхоўка можа паўплываць на стаўленне ўрачоў да цяжарнай жанчыны. Страхаванне — гэта дамова паміж страхавой кампаніяй і чалавекам. Страхавая арганізацыя прапаноўвае свае паслугі, вы плаціце грошы і ў пэўным выпадку атрымліваеце кампенсацыю. Роля медустановы зводзіцца да правільнага выяўлення дыягназу і запісу яго ў эпікрыз. А хто-небудзь ведае, ад чаго страхуюць?»*

**Leno4ka**

*«Гэта могуць быць разрывы пахвіны, ампутацыя маткі, спантанны аборт, заўчасныя роды, позні таксікоз цяжкай ступені, дыябет (калі ён узнік падчас цяжарнасці), ускладненыя роды, мёртванараджэнне, родавыя траўмы дзіцяці і многае іншае. Поўны пералік можна знайсці на сайце Белдзяржстраха.»*

**Tani_K**

*«Як толькі пра страхоўку даведалася, адразу пайшла па даведку. Напярэдадні патэлефанавала ў Белдзяржстрах і атрымала падрабязную кансультацыю. Іду на гэта, каб дактарою трымаць у тонусе. Шчыра спадзяюся, што не наступіць страхавы выпадак. Яшчэ агент сказала, што страхоўку можа аформіць кожны паўналетні член сям'і замест цяжарнай. Так што, татачкі, дзейнічайце!»*

**Даведка**

У кампаніі «Белдзяржстрах» зарэгістравана 626 выпадкаў рэпрадуктыўнага страхавання (на 1 ліпеня 2016 года).

Кошт страхавога поліса на страхавую суму 1000$ складае каля 90$ на год страхавання. Гэтыя лічбы вар'іруюцца ў залежнасці ад умоў і падвідаў страхавання. Мінімальная выплата ў страхавым выпадку — 110$, максімальная — 1000$ (у памерах страхавой сумы).

«Суму, на якую хочаш застрахаваць цяжарнасць і роды, можна абраць самому, — працягвае Тацяна. — У нас гэта была 1 000 $. Дарэчы, максімальная сума, якую кампанія гарантавала выплаціць нам у непрадказальнай сітуацыі. У залежнасці ад абранай сумы страхоўкі спецыялісты вылічваюць пэўны працэнт, які патрэбна заплаціць. У маім выпадку страхоўка каштавала 180 беларускіх рублёў. Грошы можна было заплаціць на працягу трох месяцаў».

**Вераніка УЛАСЕВІЧ.**
*veronika.ulasevich@mail.ru*